# § 2. Тэмперамент, характар, здольнасці

## Тэмперамент змяніць нельга, а характар можна?






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Тыпы тэмпераменту і іх характарыстыка.** Людзі адрозніваюцца па сваіх паводзінах. Адны — хуткія і рэзкія, як маланка, другія — марудлівыя і нетаропкія. Адны праяўляюць эмоцыі, другія халодныя і скрытныя. Гэтыя характарыстыкі чалавека звязаны з тэмпераментам. **Тэмперамент** (лац. *temperamentum* — устойлівая сумесь кампанентаў) — гэта сукупнасць індывідуальных асаблівасцей нервовай сістэмы, якія надаюць адметнасць паводзінам і дзейнасці чалавека. Тэмперамент з'яўляецца адной з найбольш значных уласцівасцей асобы. Ён складае важную частку прыроджанага кампанента псіхікі. Тэмперамент можна ўявіць як біялагічны фундамент, на якім фарміруецца асоба як сацыяльная істота. Уласцівасці асобы, што вызначаюцца тэмпераментам, з'яўляюцца найбольш устойлівымі і працяглымі.

Вучэнне пра тэмперамент вядома яшчэ са старажытнасці.

Знакаміты старажытнагрэчаскі ўрач Гіпакрат лічыў, што чалавечы тэмперамент абумоўлены тым, якая з чатырох вадкасцей пераважае ў арганізме — кроў, слізь, жоўтая жоўць або чорная жоўць. Змяшэнне гэтых вадкасцей і перавага адной абумоўлівае той тып тэмпераменту, які ёсць у чалавека, — сангвінічны, флегматычны, халерычны або меланхалічны. Гэтыя назвы для абазначэння тыпаў тэмпераменту больш за дзве тысячы гадоў таму прапанаваў іншы вядомы антычны ўрач Клаўдзій Гален.

Са старажытнасці чатыры тыпы тэмпераменту параўноўваюць з чатырма асноўнымі прыроднымі стыхіямі — агнём, зямлёй, вадой, паветрам.

Вызначце, з якім тыпам тэмпераменту суадносіцца кожная са стыхій.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Даследчыкам, які ўнёс найбольшы навуковы ўклад у вывучэнне тэмпераменту, па праву лічыцца расійскі фізіёлаг Іван Паўлаў.**

На думку І. Паўлава, аснову тэмпераменту складае тып нервовай сістэмы, які чалавек атрымлівае ў спадчыну ад біялагічных бацькоў. З пункту погляду вучонага, адметнасць нервовай сістэмы вызначаецца суадносінамі двух асноўных працэсаў — узбудлівасці і тармажэння. Выяўляюцца гэтыя працэсы ў нервовай сістэме розных людзей па-свойму. ■

**У якасці асноўных характарыстык І. Паўлаў вылучаў сілу/слабасць, ураўнаважанасць/неўраўнаважанасць, рухавасць/інертнасць нервовай сістэмы. У залежнасці ад суадносін гэтых прымет і выстройваюцца асноўныя тыпы тэмпераменту. Калі ёсць жаданне, можна вызначыць, якія прыметы тэмпераменту праяўляюцца ў паводзінах.**

З дапамогай уводнай інфаграфікі апішыце, што будуць рабіць людзі з рознымі тыпамі тэмпераменту ў наступных сітуацыях:

- адбыўся збой у рабоце камп'ютара, і была страчана вялікая колькасць інфармацыі;
- яшчэ не ўсе заданні выкананы, а час на выкананне кантрольнай работы заканчваецца;
- чалавек, які прызначыў сустрэчу, прыйшоў на яе з вялікім спазненнем. ■

**Памылкова лічыць, што ўсіх людзей можна размеркаваць толькі па чатырох тэмпераментах. Большасць людзей у розных сітуацыях праяўляюць розныя тыпы тэмпераменту. У адных сітуацыях чалавек можа рэагаваць як сангвінік, у другіх — як флегматык. Бессэнсоўна імкнуцца змяніць свой тэмперамент. Пры гэтым выхаванне чалавека можа ўнесці пэўныя карэктывы ў праявы тэмпераменту. Кожны чалавек здольны авалодаць навыкамі самакантролю, каб не стаць заложнікам свайго тэмпераменту.**

**Тэмперамент не абумоўлівае здольнасцей і адоранасці чалавека, не прымушае яго здзяйсняць добрыя або дрэнныя ўчынкі.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паколькі тэмперамент з'яўляецца пастаяннай велічынёй чалавечай псіхікі, яго асаблівасці абавязкова трэба ўлічваць пры выбары прафесіі і падчас зносін з іншымі людзьмі.

**Рысы характару.** Наша жыццё саткана з дзеянняў і ўчынкаў. Некаторыя з іх з'яўляюцца выпадковымі ці адбываюцца з-за збегу абставін. Іншыя паўтараюцца ў падобных сітуацыях, паступова ператвараючыся ў звычкі. Для вызначэння такіх учынкаў ужываюць слова «характэрны», што азначае «часта сустракаецца» або «пастаянны».

Вядомы швейцарскі вучоны XX ст. Карл Юнг, даследуючы псіхалагічныя ўстаноўкі людзей, вылучыў два асноўныя тыпы — экстраверты і інтраверты. Яны вылучаюцца пераважнай накіраванасцю на знешні або на ўнутраны свет чалавека.

У чыстым выглядзе экстраверты і інтраверты сустракаюцца рэдка. У кожным чалавеку пераважаюць пэўныя рысы абодвух тыпаў.

**Экстраверты**
**(ад лац. *extra* — па-за, звонку і *verto* — паварочваю)**

- Інтарэсы звернуты на знешні свет і дзейнасць у ім
- Вылучаюцца актыўнасцю, таварыскасцю, імкненнем дасягнуць поспеху і грамадскага прызнання
- Пераважная ўвага да навакольных прадметаў і іх уласцівасцей

**Інтраверты**
**(ад лац. *intro* — унутр і *verto* — паварочваю)**

- Галоўны інтарэс накіраваны на ўнутраны свет, на ход думак і перажыванняў
- Імкнуцца пазбягаць празмерных зносін, схільныя да самапаглыблення
- Рэчы і знешнія прыметы поспеху мала цікавяць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Паспрабуйце вызначыць, якія рысы пераважаюць у вас. Якія малюнкі вы выкарыстаеце для характарыстыкі свайго псіхалагічнага тыпу? Як вы думаеце, хто такі амбіверт?

**Характар чалавека** — гэта сукупнасць параўнаўча ўстойлівых уласцівасцей, якія праяўляюцца ў дзеяннях і ўчынках на працягу доўгага часу. Аб характары чалавека можна меркаваць, назіраючы не толькі за тым, як чалавек штосьці робіць, але і за яго жэстамі, словамі, рэакцыямі на што-небудзь.

Характар залежыць ад часу і эпохі. Некаторыя рысы характару, агульныя для многіх людзей, спараджаюцца тымі гістарычнымі ўмовамі, у якіх яны жывуць і дзейнічаюць. Вялікую ролю ў фарміраванні характару адыгрываюць іншыя людзі, асабліва калі іх меркаванні важныя для чалавека.

Характар уключае дзве асноўныя групы рыс. Да першай групы належаць рысы, у якіх праяўляюцца адносіны чалавека да навакольнай рэчаіснасці, іншых людзей, самога сябе, даручанай справы. Да другой групы належаць валявыя рысы, якія вызначаюць уменне і гатоўнасць кіраваць сваімі паводзінамі.

Першыя прыметы характару чалавека праяўляюцца ўжо ў раннім дзяцінстве. Асноўную ролю ў фарміраванні і развіцці характару ў дзіцяці адыгрываюць яго зносіны з навакольнымі людзьмі. Раней за іншыя ў характары чалавека праяўляюцца такія рысы, як дабрыня, таварыскасць, спагадлівасць, а таксама супрацьлеглыя ім якасці — эгаістычнасць, чэрствасць, абыякавасць да іншых людзей. Затым узнікаюць рысы характару, звязаныя з вучобай і працай, — акуратнасць, добрасумленнасць, настойлівасць, працавітасць. У школе інтэнсіўна



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

развіваюцца рысы характару, важныя ў зносінах з іншымі людзьмі. У падлеткавым узросце актыўна развіваюцца валявыя рысы характару, фарміруюцца маральныя асновы асобы. Да заканчэння школы характар чалавека набывае даволі стабільныя контуры.

Часта можна пачуць, як гавораць пра моцны або слабы характар. Моцным характарам валодаюць людзі, якія ставяць перад сабой вялікія задачы, дабіваюцца іх вырашэння, пераадольваюць перашкоды, што ўзнікаюць на іх шляху, не здаюцца, нават калі штосьці не атрымліваецца, здольныя ўбачыць і прызнаць свае памылкі. У аснове гэтага ляжаць развітыя валявыя і маральныя якасці асобы. Чалавек са слабым характарам не можа давесці справу да канца. І тут не дапамагаюць нават добрыя намеры і правільнае разуменне задач, якія стаяць перад ім. Без належнай настойлівасці, паслядоўнасці і ўпартасці ні адна пастаўленая мэта так і не будзе дасягнута.

Гісторыі моцных духам людзей дапамагаюць зразумець, што справіцца можна з любой сітуацыяй у любых жыццёвых абставінах. Раскажыце сваю гісторыю пра чалавека з моцным характарам. ■


*Фрагмент вокладкі графічнага рамана пра жыццё С. Хокінга*

Сусветна вядомаму фізіку-тэарэтыку Стывену Хокінгу ў дваццаць адзін год паставілі дыягназ, што гучаў як смяротны прысуд. Урачы давалі маладому чалавеку не больш за тры гады жыцця.

Але Хокінг больш за паўвека не проста змагаўся са страшнай хваробай, але і стаў за гэты час адным з самых вядомых вучоных сучаснасці.

Хокінг унёс вялікі ўклад не толькі ў тэарэтычную фізіку, але і ў папулярызацыю навукі. Нягледзячы на фізічныя абмежаванні, вялікі вучоны вёў актыўнае жыццё і ставіўся да жыцця з гумарам. Ён зняўся ў некалькіх камедыйных фільмах, дзе сыграў самога сябе. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Характар — не застылае ўтварэнне, ён фарміруецца на працягу ўсяго жыцця. І на гэтым доўгім шляху менавіта чалавек з'яўляецца асноўным творцам свайго характару. Гэты працэс называюць самавыхаваннем. У першую чаргу самавыхаванне звязана з уменнем крытычна паглядзець на сябе, заўважыць свае недахопы і вызначыць мэту работы над сабой. Найбольш эфектыўным сродкам фарміравання характару з'яўляецца праца. Пэўнае значэнне маюць ідэалы і аўтарытэты, да якіх імкнецца быць падобным малады чалавек.

**Віды здольнасцей, узроўні і спосабы іх развіцця.** Калі імкнуцца падкрэсліць, што чалавек паспяховы ў якой-небудзь сферы, то звычайна кажуць, што ён здольны. **Здольнасці** — індывідуальныя адметнасці асобы, якія выступаюць перадумовамі паспяховага выканання аднаго або некалькіх відаў дзейнасці.

**Віды здольнасцей**

| Агульныя | Адмысловыя |
|---|---|
| Неабходныя для выканання ўсіх відаў дзейнасці, уласцівыя ўсім людзям (разумовыя здольнасці, памяць, увага і г. д.) | Вызначаюць паспяховасць чалавека ў пэўных відах дзейнасці, для ажыццяўлення якіх неабходны адмысловыя задаткі (тэхнічныя, матэматычныя, музыкальныя, спартыўныя, мастацкія і інш.) |

**Агульныя і адмысловыя здольнасці ўзаемна дапаўняюць і ўзбагачаюць адна адну**

Але здольнасці не з'яўляюцца з ніадкуль. Вучоныя лічаць, што стартавым пунктам развіцця здольнасцей выступаюць задаткі. *Задаткі* — анатамічныя і фізіялагічныя асаблівасці нервовай сістэмы, якія складаюць біялагічную аснову развіцця здольнасцей. Напрыклад, задаткі інтэлектуальных здольнасцей праяўляюцца ў функцыянальных адметнасцях галаўнога мозга — жвавасці нервовых працэсаў, сіле і ўзбудлівасці нервовай сістэмы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Любыя задаткі, перш чым ператварыцца ў здольнасці, праходзяць праз агранку навучаннем і выхаваннем. Многае залежыць і ад самога чалавека. Нават самыя бліскучыя задаткі не разаўюцца ў здольнасці, калі мы не будзем прыкладаць намаганні для пераадолення цяжкасцей. Зрабіць гэта магчыма толькі з дапамогай валявых намаганняў — здольнасці кіраваць сваёй актыўнасцю і памкненнямі ў жыцці.

Здольнасці характарызуюцца рознымі ўзроўнямі выяўленасці — адоранасцю, талентам і геніяльнасцю.

*Адоранасць* — гэта своеасаблівае, незвычайнае спалучэнне здольнасцей, якое забяспечвае чалавеку магчымасць паспяхова выконваць пэўную складаную дзейнасць. Для рэалізацыі адоранасці неабходна не толькі наяўнасць здольнасцей, але і авалоданне пэўнымі ведамі і навыкамі. Напрыклад, чалавек можа валодаць здольнасцямі да праграмавання, аднак калі ён не засвоіць сінтаксіс мовы праграмавання, то не зможа рэалізаваць свой патэнцыял.

Наступная прыступка ў развіцці здольнасцей чалавека — *талент*. Пад ім звычайна разумеюць высокі ўзровень спецыяльных здольнасцей. Мы часта ўжываем гэта слова, калі характарызуем сапраўдных майстроў сваёй справы: таленавіты музыкант, таленавіты спартсмен. Таленты звычайна вылучаюцца з агульнага кола тым, што іх дзейнасць характарызуецца прынцыповай навізной, арыгінальным падыходам і творчым пачаткам.

*Геніяльнасць* — найвышэйшы ўзровень развіцця здольнасцей. Пра геніяльнасць гавораць тады, калі творчыя дасягненні канкрэтнай асобы складаюць цэлую эпоху ў жыцці грамадства і развіцці культуры.

Геніяў у чалавечай гісторыі было нямнога. Прынята лічыць, што за пяць тысяч гадоў чалавечай цывілізацыі іх было не больш за 500 чалавек. Іх імёны ведаюць многія. Вы чулі іх на ўроках матэматыкі, фізікі, гісторыі, біялогіі, літаратуры, мастацтва: Арыстоцель, Леанарда да Вінчы, Мікалай Капернік, Францыск Скарына, Чарлз Дарвін, Нільс Бор, Пётр Чайкоўскі, Альберт



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Эйнштэйн, Махатма Гандзі, Стывен Хокінг і інш. За кожным з іх — адкрыцці і ўчынкі, якія змянілі ход гісторыі чалавецтва. Каго з сучаснікаў нашы нашчадкі прызнаюць геніем? На гэта пытанне мы пакуль не ведаем адказу.

**Чаму геній заўсёды актуальны і цікавы для нашчадкаў?**





Прывядзіце пяць агульнавядомых фактаў пра Францыска Скарыну і знайдзіце пяць малавядомых. З якога ракурсу сёння раскрываецца асоба цэнтральнай постаці эпохі Адраджэння ў Беларусі?

Развіццё здольнасцей у значнай ступені залежыць ад умоў, што дазваляюць рэалізавацца задаткам. Сярод такіх умоў — асаблівасці мікраасяроддзя, у прыватнасці — сямейнага выхавання. Калі бацькі клапоцяцца пра развіццё здольнасцей сваіх дзяцей, то верагоднасць поспеху вышэйшая, чым калі дзеці пакінуты на саміх сябе. Аднак празмерны ціск на дзіця можа прывесці да адваротнага выніку — задаткі так і не стануць здольнасцямі, а жаданне развіваць свой патэнцыял згасне. Яшчэ адну групу ўмоў развіцця здольнасцей вызначае макраасяроддзе — асаблівасці грамадства, у якім нарадзіўся і расце чалавек. Умовы для вучобы і раскрыцця патэнцыялу асобы, магчымасці, што прапануюць грамадства і дзяржава ў розных сферах (сацыяльнай, культурнай і прафесійнай) жыцця, складаюць макраасяроддзе для развіцця здольнасцей чалавека.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што з пералічанага з’яўляецца праявай біялагічнай прыроды чалавека, а што — сацыяльнай: характар, здольнасці, задаткі, тэмперамент? Пацвердзіце прыкладамі з тэксту параграфа.
2. Ці згодны вы з меркаваннем аўтара? «Кожны з чатырох тэмпераментаў не з’яўляецца ні добрым, ні дрэнным. Усе яны маюць свае вартасці і недахопы. Нягледзячы на тое што найбольш прывабным выглядае сангвінік, лідарам калектыву часцей за ўсё становіцца халерык. Сярод самых надзейных і адданых людзей больш за ўсё флегматыкаў, а меланхолік здзіўляе нас сваёй чуллівасцю і дае магчымасць адчуць значнасць тых бакоў жыцця, якія мы часта не заўважаем» (фрагмент тэксту К. Рыжова).
3. Ці можна змяніць свой тэмперамент і характар? З дапамогай уводнай інфаграфікі апішыце сябе і параўнайце з характарыстыкай, якую зрабіў ваш сябар. У чым апісанні супадаюць і чым адрозніваюцца? Чаму? Наколькі карысная для самавыхавання гэта інфармацыя?
4. Лічыцца, што немалаважную ролю ў выбары будучай прафесіі адыгрывае тэмперамент. Выкарыстайце свае веды і дайце рэкамендацыі, якая з пералічаных прафесій больш за іншыя падыходзіць людзям з пэўным тыпам тэмпераменту: біржавы агент, ветэрынар, дыспетчар, сакратар, агент па рэкламе, агент па сувязях з грамадскасцю, выратавальнік, бухгалтар, ляснік, прадавец, вадзіцель грамадскага транспарту, ахоўнік, іміджмейкер. Абгрунтуйце свой пункт погляду. ■

Выканайце міні-праект «Аватары для сяброў». Стварыце візуальныя вобразы (аватары) вашых сяброў, якія будуць адлюстроўваць іх індывідуальнасць (тэмперамент, характар, здольнасці) для профіляў у адной з сацыяльных сетак (на выбар). Абмяркуйце вынік вашай работы з сябрамі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне